Дискуссионная платформа 2

# РАЗВИТИЕ МЕЖКУЛЬТУРНОГО СОТРУДНИЧЕСТВА И СЕТЕВОГО ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ В ОБЛАСТИ ОХРАНЫ ВСЕМИРНОГО НАСЛЕДИЯ. ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ КАРЬЕРЫ В СФЕРЕ ВСЕМИРНОГО НАСЛЕДИЯ

УДК 341.217:316.722(476)ЮНЕСКА

І. І. Бамбешка,
*кандыдат культуралогіі,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БЕЛАРУСІ І ЮНЕСКА Ў ГАЛІНЕ АХОВЫ І ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Страты, нанесеныя краінам свету падчас Другой сусветнай вайны, яшчэ больш, чым у міжваенны перыяд, актуалізавалі праблемы каардынацыі сумеснай дзейнасці ў розных сферах, у тым ліку і ў галіне аховы і захавання культурнай спадчыны. Стала зразумела, што толькі сумеснымі намаганнямі можна аднавіць зруйнаванае падчас ваенных дзеянняў. Таму ў кастрычніку 1945 г. была створана Арганізацыя Аб’яднаных Нацый (ААН), а ўжо ў лістападзе таго ж года – спецыялізаваная ўстанова ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА). Асноўнымі мэтамі, дэкларaванымі арганізацыяй, з’яўляюцца садзейнічанне ўмацаванню міру і бяспекі за кошт пашырэння супрацоўніцтва дзяржаў і народаў у галіне адукацыі, навукі і культуры; забеспячэнне справядлівасці і захавання законнасці, усеагульнай павагі правоў і асноўных свабод чалавека, абвешчаных у Статуце ААН, без адрознення расы, полу, мовы або рэлігіі. Сярод пытанняў, якія ахоплівае дзейнасць арганізацыі, праблемы дыскрымінацыі ў галіне

адукацыі і непісьменнасці; вывучэнне нацыянальных культур і падрыхтоўка нацыянальных кадраў; праблемы сацыяльных навук, геалогіі, акіянаграфіі і біясферы. На сённяшні дзень краінамі – удзельніцамі ЮНЕСКА з'яўляюцца 194 дзяржавы [16]. 12 мая 1954 г. у склад ЮНЕСКА ўвайшла і Беларусь. З гэтага моманту наша рэспубліка актыўна супрацоўнічае з арганізацыяй па ўсіх кірунках яе дзейнасці. У савецкі перыяд міжнародная арганізацыя з'ўлялася для БССР трыбунай для распаўсюджання інфармацыі аб рэспубліцы і адным з нямногіх каналаў яе ўдзелу ў міжнародным жыцці [12, с. 248]. Пасля прыняцця Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў 1990 г. гэта супрацоўніцтва набыло больш практычны характар. Каардынацыю супрацоўніцтва Беларусі і ЮНЕСКА забяспечвае міжведамасная Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, якая была створана ў 1956 г. Камісія ажыццяўляе сувязь паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА, інфармуе арганізацыю аб патрэбах і прыярытэтах Беларусі ў галіне адукацыі, навукі і культуры, аказвае кансультатыўнае, інфармацыйнае і культурнае садзейнічанне органам дзяржаўнага кіравання, міністэрствам і ведамствам, дзяржаўным і грамадскім арганізацыям Рэспублікі Беларусь, якія працуюць у сферы адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі. Яна кіруецца нацыянальным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутам і дакументамі ЮНЕСКА, статутам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, прынятым у 1993 г., Палажэннем аб Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, прынятым у 1997 г. Камісія садзейнічае ажыццяўленню каардынацыі і ўзаемадзеяння з ЮНЕСКА беларускіх дзяржаўных структур, установ у галіне адукацыі, навукі, культуры і інфармацыі, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, асоб з прызнаным аўтарытэтам у сферы кампетэнцыі міжнародных арганізацый, у пытаннях удзелу ў практычным ажыццяўленні кароткатэрміновых і доўгатэрміновых праграм і праектаў ЮНЕСКА. Праводзіць міжведамасныя кансультацыі па праектах праграмы і бюджэце ЮНЕСКА, накіроўвае ў сакратарыят арганізацыі свае заўвагі і прапановы па іх змесце. Рабочым органам з'яўляецца сакратарыят камісіі, які ўзначальвае адказны сакратар [8].

Беларусь супрацоўнічае з ЮНЕСКА па ўсіх кірунках дзейнасці апошняй: адукацыя, прыродазнаўчыя, сацыяльныя і

гуманітарныя навукі, культура, камунікацыя і інфармацыя. Сярод прыярытэтных – ахова культурнай спадчыны.

Беларусь далучылася да чатырох асноўных канвенцый ЮНЕСКА ў згаданай сферы: Канвенцыя аб ахове культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (1957), Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджванне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці (1988), Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1988) і Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2005) [4, с. 7; 14, с. 56]. Акрамя таго, Рэспублікай Беларусь была ратыфікавана і Канвенцыя аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення [5].

За час, які прайшоў пасля ратыфікацыі Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, 4 беларускія аб'екты былі ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны: Белавежская пушча (1992), замкавы комплекс «Мір» (2000), архітэктурны, жылы і культурны комплекс роду Радзівілаў у горадзе Нясвіж (2005), пункты Геадэзічнай дугі Струвэ (2005). Трэба адзначыць, што Белавежскі нацыянальны парк у Польшчы быў унесены ў Спіс яшчэ ў 1979 г., а ў 1992 г. пашыраны за кошт уключэння беларускай часткі пушчы. Пункты Геадэзічнай дугі Струвэ ў Беларусі атрымалі статус сумесна з пунктамі Латвіі, Літвы, Малдовы, Нарвегіі, Расійскай Федэрацыі, Украіны, Фінляндыі, Швецыі, Эстоніі [10].

Уключэнне каштоўнасцей у Спіс сусветнай спадчыны азначае, што яны становяцца аб'ектам асаблівай прававой аховы. З юрыдычнага пункту гледжання ўключэнне мае, напрыклад, рашаючае значэнне для правядзення міжнародных акцый па ахове каштоўнасцей, а з эканамічнага – магчымасці прыцягнення інвестыцый для развіцця турыстычнай сферы [7, с. 93]. Таму праца над фарміраваннем спісу айчынных каштоўнасцей для ўключэння іх у сусветны Спіс працягваецца. У Папярэдні спіс сусветнай спадчыны ўвайшлі такія знакавыя аб'екты, як Аўгустоўскі канал, Спаса-Праабражэнская царква і Сафійскі сабор у Полацку, культавыя збудаванні абарончага тыпу ў вёсках Сынкавічы, Камаі і Мураванка, драўляныя цэрквы Палесся, Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродне і інш. [15; 12, с. 249–250].

ЮНЕСКА не абмяжоўваецца аховай помнікаў культуры і прыродных каштоўнасцей. Велізарнае багацце складаюць розныя праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны: фальклор і традыцыі вуснай народнай творчасці, элементы побыту, традыцыйныя дзеянні, рытуалы, святы, абрады, звычаі, экалагічныя, этычныя, эстэтычныя і іншыя сацыяльныя ўяўленні. Пасля ратыфікацыі Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай спадчыны пачалася праца ў акрэсленай сферы. Так, было ўведзена новае паняцце «нематэрыяльная гісторыка-культурная спадчына», вызначаны крытэрыі адбору, мерапрыемствы па ахове і выкарыстанні, унесены змены ў нацыянальнае заканадаўства ў адпаведнасці з Канвенцыяй 2003 г. Пацвярджэннем аўтарытэту нашай краіны ў азначаным кірунку з'яўляецца той факт, што Рэспубліка Беларусь абіралася ў склад Міжнароднага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2006–2010) і Міжурадавага камітэта па ахове і садзейнічанні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення (2013–2017) [15]. У 2013 г. для канцэнтрацыі інфармацыі аб айчынных праявах нематэрыяльнай культурнай спадчыны пры фінансавай і кансультатыўнай падтрымцы ЮНЕСКА быў створаны спецыялізаваны сайт «Жывая спадчына Беларусі».

Камітэтам па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 2009 г. прынята рашэнне аб уключэнні у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая патрабуе тэрміновай аховы, абраду «Калядныя цары», што распаўсюджаны ў в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, у 2019 г. – вясенняга абраду «Юраўскі карагод» з в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

У апошнія гады беларускімі аб'ектамі папоўніўся Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. У 2018 г. у названы Спіс была ўключана Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай («Будслаўскі фэст», в. Будслаў, Мядзельскі раён Мінскай вобласці), у 2020 г. – культура бортніцтва Польшчы і Беларусі, у 2022 г. – саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство і ўменні.

Пры фінансавай падтрымцы ЮНЕСКА на працягу першых дзесяцігоддзяў XXI ст. быў рэалізаваны шэраг праектаў з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій. Так, у 2004 г. быў выдадзены электронны дыск «Літаратурная спадчына Беларусі, XI – сярэдзіна XX ст.»; у 2005–2006 гг. – дыск «Му-

зыка Беларусі XIX ст.» і калекцыя «Музыка Беларусі XX ст.» (складаецца з 7 кампакт-дыскаў), якія прадстаўляюць унікальную спадчыну беларускай класічнай духоўнай і камернай музыкі; у 2005 г. падрыхтаваны электронны дыск «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь», на якім прадстаўлены каталог пастаяннай экспазіцыі музея; у 2008 г. у Дзяржаўны музей тэатральнай і музычнай культуры перададзена электронная версія архіва М. К. Агінскага, які захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў (г. Масква). Таксама пры актыўным удзеле і на сродкі ЮНЕСКА быў выдадзены Лексічны атлас беларускіх дыялектных гаворак, алічбаваны відэазапісы беларускіх народных танцаў, зробленыя ў 1980-х гг., праведзена вывучэнне традыцыйных беларускіх строяў і арнаментаў Чарнобыльскай зоны [6, с. 35].

Значны аб'ём працы быў праведзены для актуалізацыі і алічбоўкі спадчыны беларускіх магнацкіх родаў. Так, у 2009 г. было падрыхтавана электроннае выданне «Кніжны збор роду Храптовічаў», якое стала вынікам супрацоўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У. І. Вярнадскага па вывучэнні, бібліяграфічнай і віртуальнай рэканструкцыі кніжнага збору, сфарміраванага ў мястэчку Шчорсы [2]. У 2009–2010 гг. у межах праекта «Radziviliana» выпушчаны электронныя дыскі «Дакументальная спадчына Радзівілаў», «Творы прадстаўнікоў роду Радзівілаў», «Іканаграфія Радзівілаў» [17; 1]. У 2010–2011 гг. сумесна з Расійскай нацыянальнай бібліятэкай быў рэалізаваны праект па алічбоўцы бібліятэчнай і архіўнай спадчыны яшчэ аднаго буйнога магнацкага роду – Сапегаў і падрыхтавана электроннае выданне «Сапегеніяна: кніжны збор роду Сапегаў» [11].

У 1993 г. пад эгідай ЮНЕСКА пачалася рэалізацыя праграмы «Памяць міру», накіраванай на захаванне рукапісаў, архіваў, кніжных помнікаў. У межах праграмы вядуцца рэестры дакументальнай спадчыны (на міжнародным, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях). У міжнародны рэестр праграмы ўключаны такія ўнікальныя дакументальныя комплексы, як «Архівы і Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў» (сумесна з Літвой, Польшчай, Расійскай Федэрацыяй, Украінай і Фінляндыяй) (2009), «Акт Люблінскай уніі» (сумесна з Латвіяй, Літвой, Польшчай і Украінай) (2017) і «Дакументальная спадчына, звязаная з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС» (2018) [13].

Названы праект стымуляваў распрацоўку нацыянальнай праграмы па захаванні дакументальных помнікаў «Памяць Беларусі». Гэта арганізацыя падтрымала шэраг ініцыятыў, такіх як стварэнне графічнай базы даных «Рэдкая кніга», першым вынікам праекта стала выданне «Геральдыка Беларусі» [6, с. 35].

Нельга не адзначыць і такі важны факт у гісторыі супрацоўніцтва нашай краіны і ЮНЕСКА ў галіне аховы і захавання культурнай спадчыны, як адкрыццё ў 2008 г. музейнай экспазіцыі «Прастора Хаіма Суціна» на базе Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна г. п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Яна прысвечана аднаму з самых вядомых мастакоў Парыжскай школы, ураджэнцу Смілавіч Хаіму Суціну. Экспазіцыя была створана па ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Кіраўнік камісіі У. Р. Шчасны сумесна з вядомым мастацтвазнаўцам, супрацоўнікам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Н. М. Усавай распрацавалі канцэпцыю яе работы [9].

Фінансавыя сродкі ЮНЕСКА выкарыстоўваліся пры рэстаўрацыі палацаў Тызенгаўза ў Паставах і Пуслоўскіх ў Косаве, сядзібы М. К. Агінскага ў Залессі. Палац Пуслоўскіх і сядзіба М. К. Агінскага былі музеефікаваны, а ў Паставах у падвальных памяшканнях палаца ў 2014 г. была створана і адкрыта музейная экспазіцыя [15; 3].

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што ў канцы XX ст. на хвалі працэсаў дэмакратызацыі і пашырэння міжнародных кантактаў, а таксама выхаду Рэспублікі Беларусь на міжнародную арэну як самастойнай дзяржавы супрацоўніцтва нашай краіны і ЮНЕСКА актывізавалася. Пачынаючы з канца XX ст. былі рэалізаваны разнастайныя праекты ў галіне аховы і захавання айчыннай культурнай спадчыны. Можна сцвярджаць, што ўдзел Беларусі ў праграмах дадзенай арганізацыі садзейнічае ўстойліваму развіццю дзяржавы, яшчэ большай інтэграцыі ў сістэму агульнаеўрапейскіх і сусветных каштоўнасцей.

1. *Антановіч, К.* «Радзівіліяна» і «Камедыі...» [Электронны рэсурс] / К. Антановіч // Культура. – Рэжым доступу: http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=4382&mode=print. – Дата доступу: 01.12.2023.

*2.* «Бібліятэка Храптовічаў» (2008–2009 гг.) [Электронны рэсурс] // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/content/o-biblioteke/nauchnaya-deyatelnost/nauchno-issledovatelskaya-deyatelnost/pdf/Бібліятэка%20Храптовічаў.pdf. – Дата доступу: 01.12.2023.

3. Государственное учреждение «Поставский районный краеведческий музей» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pastavy.museum.by/. – Дата доступа: 01.11.2023.

*4.* Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по охране культурного наследия : сб. / Белорус. фонд культуры, Науч.-техн. гос. предприятие «Белинформреставрация» ; сост. В. В. Глинник. – 2-е изд., доп. – Минск : Журнал «Тыдзень», 2000. – 193 с.

*5.* Конвенция об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения [Электронный ресурс] : утв. Указом Президента Респ. Беларусь, 4 авг. 2006 г., № 490 // Национальный правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/pdf/ 2009-67/2009-67(026-039).pdf. – Дата доступа: 08.11.2023.

*6. Лазоркина, О. И.* Международное культурное сотрудничество Республики Беларусь // О. И. Лазоркина, В. Е. Снапковский // Журнал международного права и международных отношений. – 2011. – № 4. – С. 32–40.

*7. Мартыненко, И. Э.* Участие Беларуси в деятельности ЮНЕСКО по защите всемирного культурного наследия / И. Э. Мартыненко // Беларусь в современном мире : материалы VIII Междунар. конф., посвящ. 88-летию образования Белорусского государственного университета, 30 окт. 2009 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. – Минск, 2009. – С. 93–95.

*8.* Национальная комиссия Беларуси по делам ЮНЕСКО создана 15 октября 1956 года [Электронный ресурс] // Белорусское телеграфное агентство «Новости БЕЛАРУСИ». – Режим доступа: https://www.belta.by/society/view/natsionalnaja-komissija-belarusi-po-delam-junesko-sozdana-15-oktjabrja-1956-goda-102289-2011. – Дата доступа: 22.11.2023.

*9.* О музее Сутина в Смиловичах [Электронный ресурс] // Пространство Хаима Сутина. – Режим доступа: https://soutine-smilovichi.by/about-the-museum-in-smilovichi/o-muzee. – Дата доступа: 01.11.2023.

*10.* Организация Объединенных Наций по вопросам образования, науки и культуры [Электронный ресурс] // Министерство иностранных дел Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://mfa.gov.by/mulateral/organization/list/c19b57054d08fed8.html. – Дата доступа: 01.12.2023.

*11.* Проекты по сохранению культурного наследия Беларуси с использованием новых информационных технологий, реализованные при поддержке ЮНЕСКО [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/informatsionnye-resursy/elektronnye-informatsionnye-resursy/resursy-natsionalnoy-biblioteki-belarusi/virtualnye-proekty-vystavki-i-kollektsii/virtualnye-proekty-biblioteki/virtual/yunesko-i-belarus-vekhi-sotrudnichestva/#culture. – Дата доступа: 01.12.2023.

12. *Протченко, И. Д.* Культурное сотрудничество ЮНЕСКО и Беларуси / И. Д. Протченко // Актуальные проблемы международных отношений и дипломатии (вторая половина XX – начало XXI в.) : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 25–26 апр. 2013 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Витеб. гос. ун-т, Ин-т истории Нац. акад. наук Беларуси ; редкол.: А. П. Косов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2013. – С. 248–251.

13. Сотрудничество Беларуси и ЮНЕСКО в области информации и коммуникации [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/informatsionnye-resursy/elektronnye-informatsionnye-resursy/resursy-natsionalnoy-biblioteki-belarusi/virtualnye-proekty-vystavki-i-kollektsii/virtualnye-proekty-biblioteki/virtual/yunesko-i-belarus-vekhi-sotrudnichestva/#culture. – Дата доступа: 01.12.2023.

14. *Сташкевіч, А. Б.* Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны: канвенцыянальныя і практычныя аспекты / А. Б. Сташкевіч // Человек в социокультурном измерении = Human in the socio-cultural dimension. – 2022. – № 2. – С. 55–62.

15. ЮНЕСКО и Беларусь: вехи сотрудничества [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Режим доступа: https://www.nlb.by/ content/informatsionnye-resursy/elektronnye-informatsionnye-resursy/resursy-natsional-noy-biblioteki-belarusi/virtualnye-proekty-vystavki-i-kollektsii/ virtualnye-proekty-biblioteki/virtual/yunesko-i-belarus-vekhi-sotrudnichestva/#culture. – Дата доступа: 01.12.2023.

16. Member States [Electronic resourse] // United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization. – Mode of access: https://www.unesco.org/en/countries. – Date of access: 25.11.2023.

17. Radziviliana [Электронны рэсурс] : дакументальныя помнікі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі : творы прадстаўнікоў роду Радзівілаў / Нац. б-ка Беларусі ; аўт. арт. В. Д. Бажэнава [і інш.] ; склад.: Т. І. Рошчына. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2009. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

УДК 7.05:(1-751.2)(476.7)

Ж. Е. Белокурская,
*кандидат филологических наук, доцент,*
*доцент кафедры межкультурных коммуникаций и рекламы*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*

## БЕЛОВЕЖСКАЯ ПУЩА КАК НАЦИОНАЛЬНЫЙ БРЕНД: ПРОБЛЕМЫ И ИННОВАЦИИ

Национальный бренд – это комплекс ассоциаций и представлений о той или иной стране или ее отдельных объектах,